**ТЭМА: М. Сурначоў. “У стоптаным жыце”**

**МЭТА:** Расказаць пра жыццёвы лёс аўтара верша – паэта Міколу Сурначова. Давесці да вучняў шчырасць, задушэўнасць лірычнага ўспаміну пра вайну. Засяродзіць увагу вучняў на спасціжэнні ідэйна-мастацкага зместу верша, на сродках перадачы пачуццяў аўтара. Удасканальваць уменні вучняў выразна чытаць паэтычны твор з захаваннем адпаведнай інтанацыі, правільна вызначаць выяўленчыя сродкі мастацкай выразнасці мовы. Ствbooрыць умовы для творчага самавыяўлення вучняў. Спрыяць фарміраванню паважлівага стаўлення да гістарычнага мінулага, герояў апошняй вайны.

**ЭПІГРАФ:** Вось яна, вайна – бой, смерць, паражэнне, перамога над сваёй слабасцю і ворагам… *(А.Адамовіч)*

Вайна – самае праклятае з усіх ліхаў, заведзеных жыццём на зямлі… Яна не павінна паўтарыцца. *(В.Быкаў)*

## ХОД УРОКА

**І. Арганізацыйны момант. Уступнае слова настаўніка.**

Вялікая Айчынная вайна – гэта чарговае жорсткае выпрабаванне ў гісторыі беларускага народа. Першай прыняла на сябе ўдар фашыстаў менавіта наша зямля. На сценах Брэсцкай крэпасці-героя крывёю загінуўшых у першыя дні вайны былі напісаны словы “Памром, але не здадзімся”.

Мы з вамі жывём у мірнай і незалежнай краіне – гэта шчасце. Дзеля светлага, мірнага дня людзі ў гады Вялікай Айчыннай вайны станавіліся пад варожыя кулі, аддавалі сваё жыццё. І сёння хочацца падзякаваць ім за тое, што ўжо больш за шэсцьдзясят гадоў мы жывём пад мірным небам.

**ІІ. Уводзіны ў тэму.**

Зварот да эпіграфаў са словамі А.Адамовіча, В.Быкава. Што ведаеце вы пра падзеі апошняй вайны? *(адказы вучняў)*

***Творчая праца:*** А што значыць вайна для вас, пакалення, якое яе не зведала? Прапаную вам  у сшытках скласці сінквейн са словам “вайна”. *(Пасля выканання задання вучні зачытваюць свае варыянты)*

Вайна
Знішчальная, жудасная
Паміраюць, змагаюцца, пакутуюць
Вайна забірае жыцці
Смерць

Вайна
Страшэнная, крывавая
Знішчаць, забіваць, калечыць
Вайна ламае людскія лёсы
Трагедыя

**ІІІ. Праца з тэкстам.**

Вайна заўсёды выпрабоўвае чалавека на мужнасць, патрыятызм, вернасць Радзіме. Давайце сёння ўспомнім тыя ваенныя гады, адгорнем

старонкі нашай гісторыі, трагедыі і подзвігу. Адну з такіх старонак узнаўляе верш ***М. Сурначова "У стоптаным жыце".***

<u>З пісьма М.Сурначова Паўлюку Пранузу:</u> "…я выйшаў з горада. Гэта было позна вечарам. Ад Мінска засталіся адны ўспаміны. Крыўдна стала да болю, калі глянуў я на яго, адышоўшы кіламетраў дваццаць… На шашы забіты коні, людзі, парваны правады. Моўчкі хістаюцца прыціхлыя жыты. Вось каля дарогі труп юнака-чырвонаармейца. І так нараджаецца першы верш Айчыннай вайны".

***Выразнае чытанне верша "У стоптаным жыце".*** Тлумачэнне слоў "краскі", "віцязь" ( у старажытнай Русі ўжывалася ў значэнні "адважны, доблесны воін").

***Праца над зместам верша.***

- Які настрой у вас выклікаў твор? Чаму?
- Хто з'яўляецца героем верша?
- Як склаўся лёс хлопца-віцязя?
- Якім вы ўяўляеце гэтага чалавека?
- Якія вобразна-выяўленчыя сродкі дапамагаюць выявіць аўтарскія адносіны да героя верша?
- Чаму аўтар просіць не гаварыць маці пра гібель сына?
- Растлумачце сэнс назвы твора.
- Вызначце ідэю верша.

***Складанне партытуры верша. Выразнае чытанне верша вучнямі з захаваннем адпаведнай інтанацыі.***

**IV. Творчая праца**

Адзінай крыніцай інфармацыі з фронту былі пісьмы. Яны былі афіцыйныя – ад камандавання; сяброўскія – ад блізкіх людзей, таварышаў; пяшчотныя – ад любімых і закаханых.

Давайце паспрабуем скласці тэксты такіх пісем да маці аб тым, што яе сына больш няма. Адна група будзе пісаць ад імя камандавання (камандуючага арміяй), другая – ад імя сябра, а трэцяя – ад імя каханай дзяўчыны. Паспрабуйце знайсці неабходныя словы, выразы. *(Пасля выканання задання вучні зачытваюць свае варыянты)*

**V. Падагульненне.**

Настаўнік чытае ўрывак з верша ***Н.Гілевіча "Санет памяці"***

Часцей, мой друг, прыпамінай
Імёны паўшых смерцю храбрых
За родны край, наш мілы край, -
Каб над зямлёй, што млела ў ранах,
Плыў гэты сіні-сіні ранак,
Цвіў гэты сіні-сіні май.
Часцей, мой друг, прыпамінай!

- Якія словы вы б сказалі перад брацкай магілай загінуўшым?

**VI. Дамашняе заданне.** Вывучыць верш М.Сурначова на памяць